№ 03 (872)
Студзень 2022 года

# Краязнаўчая газета

Выдаецца з красавіка 2003 года kazeta.by bfk.by


Пратакол №1 піянерскага схода. 17/IX 38 года.
1/ Разбіўка на звенні і выбранне важатых звенняў і старшыні совет-атрада і сакратара.
2/ Зацвярджэнне плана работы на верасень месяц.
3/ Рознае.
Па першаму пытанню гаварыла важатая піянераў.
Потым выбралі важатых звенняў і пастанавілі 1/ Гілепа Івана Іванавага важатым 1 га звяна і 2/ Шаравара Міхася М важатым 2 га звяна і 3/ [illegible] Івана Р. важатым 3 га звяна.
Потым абгаварвалі кандыдатуру для выбрання старшыні і сакратара совет-атрада. Пастанавілі Маляўка Рыгора ў старшынёй совет-атрада і Клыга Івана І сакратарам.
4/ Зацвердзілі план работы на верасень месяц.
План работы на верасень месяц.
17/IX-38г. Піонерскі сход.
21/IX-38г. Совет-атрад.
14-25/IX-38г. Заняткі [illegible] звяна.


28-30/IX-38г. Заняткі 2 га звяна.
11-27/IX-38г. Заняткі 3 га звяна.
Старшыня. Р. Маляўка.
Сакратар. Клыга Іван [illegible]
Важатыя. Гілеп Іван Іванаў
Хто прысутнічаў. Аляшкевіч І. Р.
4/X-38 года
Пратакол совет-атрада №1.
1/ Аб дысцыпліне піонераў.
2/ Аб выбранні важатага 2-га звяна
3/ Разработка плана работы на кастрычнік м-ц.
4/ Рознае.
Па першаму пытанню гаварыла важатая піонераў і сказала, што дысцыпліна ў піонераў вельмі дрэнная. Піонеры, як Шаравар Міхась М, Аляшкевіч Васіль Я, Аляшкевіч Іван І, дрэнна сябе паводзяць на піонерскіх сходах і звеннях, а таксама і на вуліцы. [illegible]
і Шаравару, што [illegible] сваю дысцыпліну.
Пастанавілі: Даць папярэджанне Шаравару, Аляшкевічу В. Я. і Аляшкевічу І. І.
2. Гаварыла важатая піонераў аб тым, што Шаравар М. не хоча праводзіць [illegible] сам звенні, калі праводзіць іх важатая.
Пастанавілі: Зняць Шаравара з работы і [illegible] важатым 2-га звяна Чэрніка Алеся.
3. План работы на кастрычнік месяц [illegible] і зацвердзілі. Старшыня атр: Маляўка
Сакратар: Клыга.
Пратакол піонерскага схода №2.
Парадак дня:
1. Аб падрыхтоўцы да Октября.
2. Зацвярджэнне плана работы на лістапад м-ц.
3. Рознае.
Па першаму слову гаварыла важатая піонераў і сказала, што мы павінны сустрэць [illegible] з добрымі паказчыкамі ў вучобе, [illegible]

## Памяткі Бацькаўшчыны

Неяк у адным са сваіх нарысаў у «Краязнаўчай газеце» я пісаў аб надзённай цяпер практыцы пошукаў артэфактаў у пакінутых жыхарамі дамах беларускіх вёсак, што знікаюць. На жаль, ні музеі, ні сельсаветы на такія заклікі не рэагуюць. Апошнія лічаць сваім абавязкам навесці парадак на зямлі і, калі былы гаспадар пэўны час не з’яўляецца на сваім падворку, спяшаюцца з дапамогай бульдозера прыбраць спарахнелую пабудову і здзічэлы сад-агарод. Але пры гэтым пад бульдозер трапляюць і ўнікальныя музейныя рэчы, і дакументы, што характарызуюць мінулую эпоху. Менавіта адзін такі дакумент быў знойдзены ў вёсцы Астрава Капыльскага раёна зусім нядаўна.

**Гістарычная даведка.** Вёска Астрава знаходзіцца за 2 км ад шашы Слуцк – Баранавічы, пасярэдзіне паміж мястэчкамі Цімкавічы і Семежава. У пачатку XVIII стагоддзя яна налічвала 18 двароў, цяпер пастаянна жыве каля 10-і сямей. Прозвішчы астраўцоў, дзякуючы ўважлівым адносінам да гісторыі перапісчыкаў насельніцтва, практычна не змяняліся на працягу трох стагоддзяў: Сокалы, Лобаны, Клыгі, Каршуны, Шаравары, Буракі, Маляўкі, Чэрнікі, Галоцікі, Жукі, Гілепы, Пешкуры, Аляшкевічы.

Услухайцеся ў музыку гучання гэтых прозвішчаў і вы зразумееце, што Астрава – гэта сапраўдны востраў (так раней яно і было) этнаскарбаў, які неабходна вывучаць. А пачынаць спецыялістам трэба са збору артэфактаў на закінутых сядзібах вёскі, безумоўна, са згоды мясцовых улад.

**Прыклад да пераймання.** Мой пляменнік Аляксей Шульга (па маміным прозвішчы – Сокал) год таму наведаў радзіму сваіх продкаў і выпадкова зайшоў у кінутую ўжо хату суседзяў. Там, сярод «друзу і смецця», ён знайшоў запраўленыя ў рамку сямейныя фотаздымкі (гістарычныя таксама). Як выхаваны патрыёт, Аляксей не мог пакінуць музейныя матэрыялы на пагібель. Ён пачаў разбіраць рамку і за двайной паперaю ў ёй знайшоў схаваныя там цікавыя дакументы. Дакументы гэтыя аб многім могуць расказаць: як да Вялікай Айчыннай вайны жыла астраўская моладзь, як яна вучылася і адпачывала. У тайніку былі знойдзеныя пратаколы піянерскага сходу і пратаколы савета атрада Астраўской школы, датаваныя 17.09.1938 – 06.02.1939.

Адметнасцю іх з’яўляецца тое, што яны даюць падрабязныя характарыстыкі піянераў. Старшыня савета атрада (верагодна, Міхаіл Галоцік) разумеў, што характарыстыкі не павінны трапіць у рукі ворага. Таму з пачаткам вайны ў 1941 годзе ён і зрабіў тайнік у сваёй хаце.

Хачу звярнуць увагу на прозвішчы піянераў. Яны такія ж, што і ў XVIII стагоддзі: Маляўкі, Гілепы, Галоцікі, Шаравары, Клыгі, Чэрнікі і іншыя.

Павярхоўны (і непрафесійны) аналіз гэтых дакументаў эпохі дае і некаторыя дадатковыя сведчанні патрыятычнага характару: аб усебаковым жыцці моладзі (вучоба, паводзіны, у тым ліку на вуліцы, сустрэчы новага 1939 года каля елкі і іншае); аб ужыванні беларускай мовы (дома, на вуліцы, у дакументальным абароце); аб выхаванні дзяцей, як сямейным, так і школьным у вёсцы Астрава.

Для мяне, астраўца па паходжанні, зразумела, што ў схованцы знойдзеная толькі частка пратаколаў. Большая частка, як і многія дакументы архіўнай каштоўнасці, захоўваліся ў самой школе. Яе ў 1943 – пачатку 1944 года спалілі партызаны, бо ў ёй спыняліся фашысты на начлег. На жаль, фашысты працягвалі і далей спыняцца на начлег у Астраве, толькі цяпер выганялі са сваіх дамоў на вуліцу жыхароў вёскі. Аб чым сведчу як жывы дакумент эпохі.

Таму пад канец маіх нататак – **Зварот да кіраўнікоў мясцовых сельскіх Саветаў дэпутатаў.** Не спяшайцеся знішчаць пабудовы ў вёсках без дэтальнага іх абследавання спецыялістамі раённых музеяў і бібліятэк, а таксама мясцовымі краязнаўцамі. Прыміце за правіла запрашаць іх да ўдзелу ў складанні актаў зносу той ці іншай пабудовы, што згубіла свайго ўладальніка. Толькі ўважлівае стаўленне да спадчыны ўратуе нас ад бяспамяцтва.

*Уладзімір ГІЛЕП,*
*1938 года нараджэння*
*ў в. Астрава*

# Вялікі рыцар Адраджэння



Сёлета 23 студзеня спаўняецца 80 гадоў ад часу нараджэння Генадзя Сакалова-Кубая (1942 – 1998). Гэта быў адмысловы спецыяліст у галіне мастацкай практыкі, гісторыі мастацтва, мастацтвазнаўства, мастацкай адукацыі, краязнаўства. Генадзь даследаваў сармацкі партрэт, батальны жанр у беларускім выяўленчым мастацтве, мініяцюры Радзівілаўскага летапісу, гравюры ў выданнях Францыска Скарыны. Вывучаў творчасць нашых мастакоў-класікаў Францішка Смуглевіча, Валенція Ваньковіча, Яна Дамеля, Януара Сухадольскага, Вінцэнта Дмахоўскага, Міхала Андрыёлі, Нікадзіма Сілівановіча, Людаміра Сляндзінскага, пісаў пра сучасных беларускіх мастакоў. Асноўныя мастацтвазнаўчыя творы: «Партрэт у беларускім выяўленчым мастацтве XII – пачатку XX ст.»; «Партрэтны жывапіс Беларусі XIV – XVI стст»; «Партрэт Крыштапа Весялоўскага»; «Партрэт Эўфразіны Тышкевіч». Педагагічную дзейнасць пачаў у 1986 г. Працаваў у Рэспубліканскай школе-інтэрнаце па музыцы і выяўленчым мастацтве імя І. Ахрэмчыка, Мінскай мастацкай вучэльні імя А. Глебава, Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры, Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. Ён плённа даследаваў Вільню ў 1960 – пачатку 1970-х гг. Генадзь быў спецыялістам надзвычай грунтоўнай адукацыі, высокага інтэлекту. Ён зрабіў велізарны ўплыў на сваіх выхаванцаў, якія прайшлі разам з настаўнікам грунтоўную школу беларусазнаўства. Генадзь пасеяў выдатнае насенне будучыні нашай культуры, нашай краіны.

*Мікола КУПАВА*
*На фота выцінанкі «Вільня», «Беларусь – муза Максіма Багдановіча»*






## На тым тыдні...

### *Ратуемся спадчынай*

✓ Часовая літаратурна-мастацкая экспазіцыя **«Зямля навагрудская, краю мой родны!..»**, прымеркаваная да 190-годдзя з дня стварэння велічнай эпапеі Адама Міцкевіча «Пан Тадэвуш, або Апошні наезд у Літве» адкрылася **10 студзеня** ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры. У аснову экспазіцыі пакладзена фотавыстава «Па мясцінах Адама Міцкевіча», створаная пасля міжнароднага фотапленэра, што адбыўся ў 2008 г. На экспазіцыі прадстаўлены творчыя працы фотамастакоў-беларусаў Валерыя Сібрыкава, Сяргея Плыткевіча, Валерыя Вядрэнкі, Віктара Сядых, Наталлі Ракіцкай, літоўцаў Сігітаса Канцявічуса, Рамуальдаса Вайткуса, паляка Ежы Пёнтака і інш. У вітрынах можна пабачыць выданні паэмы «Пан Тадэвуш» у перакладзе Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, Браніслава Тарашкевіча, Пятра Бітэля і Язэпа Семяжона, а таксама выданні на польскай, беларускай і рускай мовах 1998 г. Цэнтральнае месца экспазіцыі займае скульптура «Адам Міцкевіч» Андрэя Заспіцкага (Мінск, 1998).

Працуе выстава па 18 лютага.

✓**11 студзеня** ў Мазыры ў мастацкай галерэі цэнтральнай бібліятэкі імя А.С. Пушкіна «Зачараваныя родным краем» адкрылася персанальная выстава работ мазырскага мастака Юлія Збароўскага. Юлій Францавіч нарадзіўся ў Мазыры ў 1967 г. Сваю творчую дзейнасць пачаў як настаўнік малявання малодшых класаў. Зараз працуе мастаком-афарміцелем Палаца культуры ААТ «Мазырскі НПЗ». На карцінах, выстаўленых у галерэі, можна пабачыць загадкавыя, цікавыя партрэты, розныя сюррэалістычныя сюжэты, якія сапраўды прымушаюць спыніцца, задумацца, паразважаць. Здаецца, што задума арганізатараў гэтай выставы – абудзіць у наведніках уяўленне і разважлівасць – дасягнула сваёй мэты.



*Юлій Збароўскі і Марына Адосій на адкрыцці выставы*

✓**11 студзеня** ў зале беларускай літаратуры Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адкрылася выстава **«Напрадвесні беларускай навукі»**, прымеркаваная да 100-годдзя з дня заснавання Інстытута беларускай культуры (Інбелкульта), першай у гісторыі Беларусі шматгаліновай навукова-даследчай установы, папярэдніка НАН Беларусі. На ёй экспануюцца каля 150-і выданняў, асноўную частку з якіх складаюць выданні Інбелкульта. Сярод прадстаўленых кніг – «Беларуская навуковая тэрміналогія», «Беларускі архіў», «Апісанне Горацкага раёну», «Чатырохсотлецце беларускага друку», «Віцебскі краёвы слоўнік» М. Каспяровіча, «Говоры восточных уездов Гомельской губернии в их современном состоянии» П. Растаргуева, «Беларуская архітэктура ў XI – XII стст.» М. Шчакаціхіна і шмат іншых. Экспазіцыя аздоблена фотаздымкамі і дапоўнена сучаснымі выданнямі аб навуковай дзейнасці Інбелкульта. Працуе выстава па 28 лютага.

✓Бібліятэкары бібліобуса Дзятлаўскай раённай бібліятэкі разам з творчым калектывам сектара пазастацыянарнага абслугоўвання насельніцтва Дзятлаўскага раённага цэнтра культуры і народнай творчасці **13 студзеня** ладзілі зімовыя шчадроўкі **«Ішла Калядка калядуючы»** для жыхароў вёсак Руда-Яварская, Капці, Скрундзі, Чарлёнка, Падвялікае. На кожным прыпынку вяскоўцаў віталі калядоўшчыкі, выконвалі віншавальныя калядныя песні, прысвечаныя гаспадару, гаспадыні. У песнях праслаўляліся здольнасці і якасці гаспадароў, выказваліся пажаданні, каб быў добры ўраджай, каб жывёла дала вялікі прыплод. Жыхары віталі Казу – сімвал урадлівасці і дабрабыту, заклікалі яе на свае падворкі, бо ёсць павер'е: «Дзе каза ходзіць, там жыта родзіць». Людзі загадвалі на тое, што новы год будзе лепшым. Дзякуючы такім сустрэчам жыхары аддаленых вёсак атрымалі зарад бадзёрасці, станоўчыя эмоцыі і адчулі сапраўднае свята.



*«Ішла Калядка калядуючы»*

✓**14 студзеня** ў гродзенскай мастацкай галерэі «400 квадратаў» адкрылася выстава вядомага беларускага мастака Паўла Татарнікава **«Дом».** Гэта – рэтраспектыва творчасці аўтара з нагоды яго 50-гадовага юбілею. Экспазіцыя алегарычна раскрывае розныя грані творчай асобы П. Татарнікава. Умоўна яна падзяляецца на некалькі сэнсавых частак. Першая – гэта падмурак «Дома» – сям'я. Аўтар нарадзіўся ў творчай, мастацкай сям'і. Павел прысвячае гэтую выставу таксама 80-годдзю бацькі, мастака Юрыя Татарнікава (1941 – 2005), чыя праца «Дом» і дала назву выставе: на карціне намаляваны дом, у якім нарадзіўся П. Татарнікаў. У экспазіцыі прадстаўлены таксама дзіцячы партрэт аўтара, намаляваны яго маці, Валянцінай Татарнікавай-Панок. Ёсць раннія працы Паўла, якія ён маляваў у дзяцінстве, а таксама малюнкі яго сына, Яна Татарнікава. Другая частка – гэта знакамітыя ілюстрацыі аўтара. У экспазіцыі прадстаўлены ілюстрацыі для зборніка беларускіх народных казак «Залатая шарсцінка, срэбраная павуцінка» і для кнігі па кітайскім міфе «Стралок і дзесяць сонцаў». А таксама гістарычныя рэканструкцыі беларускіх гарадоў і замкаў, партрэтаў славутых землякоў. Гэта творы «Пінскі кірмаш», «Дунін-Марцінкевіч і Манюшка», «Залессе», «Гальшаны», «Полацк», «Віленскі ўніверсітэт», «Навагрудак». Асабліва цікавымі для жыхароў горада могуць быць гістарычныя рэканструкцыі старога замка Гродна. У наступнай частцы экспазіцыі прадстаўлена серыя літаграфій аўтара. Гэта лірычныя, больш інтымныя працы «Ён» і «Яна», «Ранішнія забавы», «Галава Адама», трыпціх «Першынец» і серыя літаграфій «Танец». І адметнасцю экспазіцыі, не «таемным пакоем» з'яўляецца серыя эскізаў і замалёвак, падрыхтоўчых малюнкаў, графічных рэканструкцый на розныя тэмы: міфалагічную, гістарычную, казачную, літаратурную.

Выстава працуе да 28 лютага.

*Скарыстаная інфармацыя Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры, Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, мастацкай галерэі «400 квадратаў» і нашых аўтараў Таццяны Пракопчанка, Марыны Лапушка*

# Фотаальбом Міколы Арочкі




***У выдавецтве «Кнігазбор» пабачыла свет выданне Сяргея Чыгрына «Дзяліў трывогу і настрой» (Мікола Арочка на фотаздымках). Фотаальбом прысвечаны жыццю і творчасці доктара філалагічных навук, паэта, літаратуразнаўца і перакладчыка Міколы Арочкі (1930 – 2013). Наклад кнігі 50 асобнікаў.***

Фундатар выдання – жонка пісьменніка Марыя Іванаўна. У альбоме сабраныя фотаздымкі з прыватных архіваў Марыі Арочка, С. Чыгрына, Адама Мальдзіса, Міхася Скоблы, Алеся Бельскага, Віктара Шніпа, Анатоля Вераб'я, Сцяпана Лаўшука, а таксама са збораў Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва, Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры. На адвароце вокладкі выдання змешчаная «Балада Міколы Арочкі» В. Шніпа.

Трэба дадаць, што альбома ўжо няма ў продажы, яго мажліва набыць хіба што ў Марыі Іванаўны. Таму спадзяюся, што альбом будзе перавыдадзены.

*Аляксей ШАЛАХОЎСКІ*

*Царкоўнае краязнаўства*

# Феафан Семяняка – святар воляю Божай



***Феафан Семяняка***

Некалькі месяцаў таму ў Дзятлаўскім дзяржаўным гісторыка-краязнаўчым музеі адбылася прэзентацыя кнігі Георгія Роя «Накрышкі. Летапіс Барыса-Глебскай царквы» (інтэрв'ю з айцом Георгіем пра гісторыю стварэння кнігі «КГ» змяшчала летась у №№ 39 – 40. – **Рэд.**). Кніга стала настольнай для многіх дзятлаўчанаў, якія цікавяцца гісторыяй свайго краю, шукаюць факты з радаводу ўласных сем'яў, а таксама для краязнаўцаў і супрацоўнікаў сектара па турызме Дзятлаўскага райвыканкама, бо з дапамогай гэтага ўнікальнага выдання можна пракласці не адзін турыстычны маршрут у мясцінах, звязаных са славутым родам Стравінскіх і партызанскім рухам часоў Вялікай Айчыннай вайны.

Асабіста мяне зацікавіла тэма рэпрэсаваных святароў. Тэма балючая, да канца яшчэ не раскрытая, але вельмі цікавая. Мужнасць людзей, якія прайшлі праз турмы, высылкі, лесапавалы, выклікае захапленне. А калі гэта яшчэ нашыя землякі, то хацелася дакапацца да прычыны таго, за што чалавек пацярпеў, што дало сілы вытрымаць усе выпрабаванні і застацца сабой.

Адным з такіх святароў, згаданых у кнізе Георгія Роя, аказаўся Феафан Семяняка. На пачатку XX стагоддзя ён некаторы час служыў псаломшчыкам у Накрышскай царкве. Загінуў у 1937 годзе, значыць, сёлета спаўняецца 85 гадоў з дня яго смерці. І захацелася гэтую дату не прамінуць, яшчэ раз узгадаць імя нашага земляка, які загінуў за праваслаўную веру, стаў прыкладам для многіх людзей.

І яшчэ адзін цікавы факт: нарадзіўся святар 6 студзеня, калі людзі рыхтуюцца да Куцці, чакаюць з'яўлення на небе першай зоркі і спадзяюцца на цуды, на Божую ласку. Ці не такой зоркай стаў для сям'і Семянякаў маленькі Мікалай, народжаны на славу беларускай царквы і вялікія пакуты?

У двухтомніку Леаніда Маракова «Рэпрэсаваныя праваслаўныя свяшчэннаі царкоўнаслужыцелі Беларусі. 1917 – 1967» змешчаны артыкул, прысвечаны Феафану Семяняку (Мікалаю Адамавічу). Аўтар працаваў у архівах, знайшоў максімальна даступныя матэрыялы пра святара. Таксама пра яго пісаў у газеце «Перамога» святар Расціслаў Салаўёў, калі служыў настаяцелем Накрышскай царквы. Яго артыкул, ужо на рускай мове, ёсць на сайце dyatlovo.by.

Аднак хочацца яшчэ раз нагадаць людзям пра гэтага чалавека, каб помнілі і ведалі: дзятлаўская зямля мае кім ганарыцца.

У адкрытым спісе ахвяраў палітычных рэпрэсій у СССР, база дадзеных якога ўжо ўтрымлівае інфармацыю пра 62 745 чалавек, ёсць і імя Мікалая Адамавіча Семянякі. Тут падаецца, што ён нарадзіўся 19 студзеня 1879 года, а не шостага. Прычынай можа быць падача даты па старым і новым стылі. Ды і ў дакументах дата нараджэння часта блыталася, падавалася па-рознаму. Месца нараджэння: Гродзенская губерня, Слонімскі павет, мястэчка Дзятлава. Нацыянальнасць – рускі, служачы, адукацыя сярэдняя спецыяльная, прафесія – архіепіскап (г. Мінск), дата расстрэлу – 10 лістапада 1937 года, месца смерці – Хабараўск, Дальлаг.

Кароткія звесткі з архіўнай даведкі КДБ Беларусі 31424-с, як і пра кожнага вязня, але перад вачыма праходзіць усё жыццё чалавека. А хто больш-менш цікавіцца тэмай рэпрэсій, уяўляе, што хаваецца за гэтымі фактамі.

Нарадзіўся Мікалай Семяняка ў сям'і настаўніка (некаторыя крыніцы сцвярджаюць, што ў сям'і пісара). Скончыў Жыровіцкае духоўнае вучылішча, Літоўскую (Віленскую) духоўную семінарыю, рукапакладзены ў іерэя ў 1905 годзе. Служыў у храмах Гродзенскай губерні. Аднačасова (са жніўня 1911 года і, верагодна, па запрашэнні святара Яраслава Савіцкага) выкладаў Закон Божы ў сіроцкім прытулку Гродзенскага Чырвонастоцкага Раства-Багародзіцкага жаночага манастыра Сакольскага павета Гродзенскай губерні. Займаўся гісторыяй краю, манастыра, пісаў вершы, якія друкаваў у часопісе «Русский паломник».

На пачатку Першай сусветнай вайны з жонкай, сынам і дачкой быў у бежанстве ў Тыфлісе. З 1916-га служыў у царкве на Брацкіх могілках Севастопаля, потым у Міннай школе. У 1921 годзе пераехаў з сям'ёй у Маскву. Служыў у храме Свяціцеля Алексія ў Глінішчаўскім завулку, у царкве Екацярынінскай бальніцы каля Пятроўскіх варот, у Барыса-Глебскай царкве на вуліцы Вароўскага.

Першы раз арыштаваны 30 лістапада 1925 года супрацоўнікам АДПУ Чацкім і іншымі па ордэры, падпісаным Ягодам. Праходзіў па адной справе з мітрапалітам Пятром (Палянскім). 21 мая 1926 года асуджаны за «контррэвалюцыйную дзейнасць» да 2-х гадоў пазбаўлення волі і высланы ва Усць-Сысольск (Удмурцкая АССР). Пад час зняволення аўдавеў.




Пасля вызвалення жыў у Маскве, служыў настаяцелем Барыса-Глебскай царквы. 13 снежня 1930 года па дабраславенні мітрапаліта Сергія (Страгародскага) адбылася хіратонія ў Пакроўскім саборы ў епіскапа Мінскага, і ў лютым 1931-га святар выехаў у Мінск. Богаслужэнні адпраўляў у Мікалаеўскай царкве ў пасёлку Козырава (прыгарад Мінска, цяпер у межах горада). Дзявятага ліпеня 1934 года ўзведзены ў сан архіепіскапа. Па ўспамінах протаіерэя Барыса Васільева, Феафан сярод людзей карыстаўся вялікай папулярнасцю і павагай.

Паўторна арыштаваны 9 красавіка 1935 года. Абвінавачваўся НКУС як «адзін з кіраўнікоў антысавецкай арганізацыі ў пасёлку Козырава». Асуджаны асобай нарадай пры НКУС у жніўні 1935-га разам з іншымі святарамі, старастам і актыўнымі прыхаджанамі козыраўскай царквы за «контррэвалюцыйную дзейнасць» да 8-і гадоў калоніі. Этапаваны ў Хабараўскі край. У зняволенні прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 10 лістапада 1937 года.

Па першай справе пытанне аб рэабілітацыі разглядалася Генеральнай пракуратурай РФ, па другой (№ 31424-с; захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі) рэабілітаваны ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда БССР 4 красавіка 1990 года, па трэцяй – пракуратурай Хабараўскага края 16.01.1989 года.

Мы мала ведаем пра подзвігі святароў. Прычына таму зразумелая: у савецкі час пра іх не прынята было гаварыць, а тым больш даследаваць іх жыццё і дзейнасць. Але ўсё мяняецца, і сёння згубленыя імёны вяртаюцца дзякуючы намаганням гісторыкаў-прафесіяналаў і руплівцаў краязнаўчай справы.

*Алена АБРАМЧЫК,*
*старшы навуковы супрацоўнік*
*Дзятлаўскага дзяржаўнага*
*гісторыка-краязнаўчага музея*

*(Заканчэнне. Пачатак у № 2)*

# З гісторыі школы

## Ад польскай сямігадовай да рускай сярэдняй

Навагрудчанін не прыжыўся на Палессі, яго ўвесь час цягнула на радзіму, і таму ў 1921 г. сям'я Рамановічаў вярнулася ў Падкасоўе. Сцяпан Канстанцінавіч настаўнічаў у роднай вёсцы, пакуль не перабраўся зноў у Карэлічы, дзе выкладаў матэматыку ў польскай сямігодцы, дырэктарам якой быў Антоній Дулемба. Менавіта ў гэты час у школе вучыўся будучы навуковец і акадэмік Міжнароднай акадэміі астранаўтыкі Барыс Кіт, які на ўсё жыццё захаваў пра свайго настаўніка самыя добрыя і светлыя ўспаміны. Сын С. Рамановіча Валянцін таксама наведваў карэліцкую школу ў 1924 г., пакуль не паступіў у Навагрудскую польскую гімназію імя А. Міцкевіча. Гэтаму хлопчыку наканавана было стаць таленавітым мастаком, выкладчыкам Віленскага ўніверсітэта, стварыць шэраг жывапісных палотнаў і медзярытаў. Яго высокамастацкімі гравюрамі ўпрыгожаная сёння адна з залаў Тракайскага замка.

Сярод тых, хто вучыўся ў польскай сямігодцы, былі будучыя медыкі, настаўнікі, бухгалтары, навукоўцы. З 1936 г. наведвала школу будучая заслужаная настаўніца БССР Кацярына Главінская з Палужжа, якая пасля вайны настаўнічала ў Карэліцкім раёне, узначальвала школу ў роднай вёсцы. Пачыналі вучобу ў польскай сямігодцы ўраджэнцы Карэлічаў беларускія вучоныя Андрэй і Аляксандр Богушы, а таксама сын мясцовага святара Расціслаў Душук, які пазней апынуўся ў Маскве, дзе стаў прафесарам ветэрынарыі.

У час Вялікай Айчыннай вайны школа працягвала працаваць, дзеці маглі вучыцца, прычым заняткі вяліся на беларускай мове, але вясной 1944 г. нямецка-фашысцкія захопнікі ператварылі навучальную ўстанову ў казарму, размясціўшы тут гарнізон Беларускай краёвай абароны. Напрыканцы красавіка 1944-га пад час налёту партызанаў на казарму школа пацярпела ад пажару. Пасля вызвалення раёна яе аднаўлялі цягам трох гадоў – да восені 1947-га. Увесь гэты час заняткі праводзіліся ў двухпавярховым будынку на плошчы 17 верасня, дзе цяпер месціцца рэдакцыя раённай газеты «Полымя». Дзіцячыя галасы загучалі там ужо ўвосень 1944 г. Дырэктарам сярэдняй школы з пачатку жніўня быў прызначаны настаўнік С. Рамановіч, але ўжо ў лістападзе яго замяніў на гэтай пасадзе Іван Ігнатовіч.

І. Ігнатовіч нарадзіўся ў Карэлічах, скончыў народнае вучылішча, у 1908 г. здаў экзамен і атрымаў правы працаваць настаўнікам пачатковых класаў. Вось толькі стаў ён не настаўнікам, а землямерам, і з 1909 да 1918 г. працаваў у землеўпарадкавальнай камісіі ў Мінску. З 1918-га займаўся навуковай працай у Навукова-даследчым інстытуце сельскай і лясной гаспадаркі Беларусі і адначасова займаў пасаду землеўпарадкавальніка ў сістэме Наркамзема БССР. У 1924 – 1926 гг. выкладаў курс геадэзіі спачатку ў Мінскім палітэхнікуме, потым у каморнцкай школе сістэмы Наркамзема БССР. У 1925 – 1929 гг. вучыўся ў Беларускім дзяржаўным універсітэце на факультэце права і гаспадаркі, атрымаў спецыяльнасць юрыста-эканаміста. У 1930-м быў рэпрэсаваны і высланы ў Мінусінск Краснаярскага края. З 1931 да 1936 г. Іван Сцяпанавіч працаваў там гарадскім каморнікам і інжынерам-землеўпарадкавальнікам, пазней займаўся гэтай жа справай у Арле, а з 1938-га стаў настаўнікам геаграфіі і астраноміі ў Наўлінскай сярэдняй школе Арлоўскай вобласці і завочна вучыўся ў педінстытуце. Калі Арол быў акупаваны, ён вярнуўся на радзіму і выкладаў геаграфію і фізіку ў карэліцкай школе. Пасля вызвалення раёна быў прызначаны дырэктарам школы, але знаходзіўся на гэтай пасадзе нядоўга. Працаваў настаўнікам у Карэлічах да выхаду на пенсію ў 1956 г., яго агульны працоўны стаж склаў больш за 46 гадоў.

З 15 снежня 1945 да пачатку жніўня 1953 г. дырэктарам школы працаваў удзельнік Вялікай Айчыннай вайны капітан Макар Мацюшонак. Менавіта ён займаўся аднаўленнем старога школьнага будынка. Даводзілася вырашаць і шмат іншых праблем: настаўнікі не былі забяспечаныя камунальнымі паслугамі, заробкі затрымлівалі, а паёк (мука, цукар, мыла, газа) часам зусім не выдавалі. Акрамя таго, у школе не хапала падручнікаў.


Міхаіл Бельскі

Многія мясцовыя дзеці пасля вайны засталіся без бацькоў і знаходзіліся ў дзіцячым доме, які ўзнік у час вайны і размяшчаўся ў будынку былой саўгаснай канторы. Туды трапілі і дзеці, якіх немцы ў 1943 г. не давезлі ў Германію з-за ўзарванай партызанамі чыгункі. Перад адступленнем немцаў дзяцей вывезлі з Карэлічаў, каб не загінулі. Пасля вызвалення раёна 82 чалавекі знаходзіліся ў вёсцы Працяневічы Карэліцкага сельсавета. Спалі на падлозе, у большасці з іх не было ні адзення, ні абутку. Пазней дзіцячы дом быў пераведзены ў Карэлічы ў прасторнае памяшканне з кухняю і пральняю. Спачатку ўстанову ўзначаліла Дар'я Прохарава, у 1945 г. – Варвара Марчанкава, з 1953 г. – Ніна Цімошанкава.

Шмат гадоў узначальваў сярэднюю школу ўдзельнік Вялікай Айчыннай вайны Міхаіл Бельскі, прызначаны на гэтую пасаду 8 красавіка 1957 г. Лёс яго склаўся даволі драматычна. Як сведчаць дакументы, нарадзіўся Міхаіл Паўлавіч у 1920 г. у вёсцы Шмялі Барысаўскага раёна ў сялянскай сям'і. У 1938-м скончыў Зембінскую СШ і паступіў на гістарычны факультэт Белдзяржуніверсітэта. У 1941 г. юнак паспеў закончыць тры курсы. Вораг імкліва набліжаўся да сталіцы, і шмат хто з жыхароў пакідаў Мінск. Рушыў на ўсход і Міхаіл. 13 ліпеня апынуўся ў Смаленскай вобласці і ў Сухініцкім РВК добраахвотна ўступіў у шэрагі Чырвонай Арміі. Спачатку юнака накіравалі на вучобу, ён стаў курсантам вучэбнай каманды ў горадзе Яфрэмаве Тульскай вобласці. У маі 1942-га Міхаіл Паўлавіч скончыў пяхотнае вучылішча і, атрымаўшы званне лейтэнанта, знаходзіўся ў дзеючай арміі ў складзе 192-й стралковай дывізіі 676-га стралковага палка ў якасці камандзіра ўзвода. У пачатку ліпеня полк быў накіраваны ў Сталінградскую вобласць на Паўднёва-Заходні фронт. Тут маладога лейтэнанта прызначылі памочнікам камандзіра мінамётнай роты. Неўзабаве полк трапіў у акружэнне, вырвацца з якога байцы не здолелі, і ўлетку 1942 г. М. Бельскі трапіў у палон. Спачатку ён знаходзіўся ў лагеры для ваеннапалонных у Нюрнбергу, а потым быў вывезены ў Нарвегію на востраў Штарфозен. Толькі ў маі 1945 г. прыйшло вызваленне, і ён змог вярнуцца на радзіму. Восенню 1945-га працаваў старшым інспектарам па кадрах у будраёне горада Дрыса (цяпер Верхнядзвінск). У канцы лістапада быў адкамандзіраваны ў 362-і стралковы полк, адкуль неўзабаве дэмабілізаваўся ў званні лейтэнанта. Міхаіл Паўлавіч доўгі час марыў вярнуцца да вучобы, але спачатку лёс прывёў яго ў школу, дзе пасля вайны не хапала настаўнікаў. Са студзеня 1946 г. М. Бельскі пачаў працаваць настаўнікам ў Смольчыцкай НСШ Карэліцкага раёна, але ўжо ў жніўні яго перавялі выкладчыкам гісторыі ў Карэліцкую СШ, а 15 кастрычніка прызначылі дырэктарам Карэліцкай школы рабочай моладзі.


Іван Ігнатовіч з сынам

# ў Карэлічах

Адначасова ён завочна заканчваў вучобу на гістарычным факультэце БДУ. У 1949 г., пасля некалькіх гадоў вымушанага перапынку, нарэшце атрымаў вышэйшую адукацыю. Пазней Міхаіл Паўлавіч быў прызначаны завучам Карэліцкай СШ, а ў 1957-м – дырэктарам. Ён узначальваў школу 15 гадоў і за гэты час паспеў здзейсніць шмат добрых справаў. Ён шчодра дзяліўся ведамі з іншымі настаўнікамі, а маладым педагогам мог умела і тактоўна даць добрую параду.

10 красавіка 1958 г. Карэліцкі райвыканкам прыняў рашэнне аб адвядзенні зямельнага ўчастка пад будаўніцтва новага будынка Карэліцкай СШ. Займацца гэтай важнай справай давялося М. Бельскаму. Колькі бяссонных начэй правёў дырэктар, колькі намаганняў прыклаў, каб пабудаваць школу ў прызначаны тэрмін! Загадзя было падрыхтаванае новае абсталяванне для слясарнай і сталярнай майстэрняў, кабінетаў фізікі, хіміі, набыты новы спартыўны інвентар, лабараторныя сталы, класныя дошкі, партрэты, карціны, заказаныя парты і іншая мэбля.

У канцы жніўня 1961 г. будаўніцтва новай трохпавярховай школы было завершанае, у 1961/1962 навучальным годзе ў ёй займалася 605 вучняў. Тады ж дзесяцігодка была пераўтвораная ў адзінаццацігадовую школу з вытворчым навучаннем. У новым будынку з'явіліся вучэбныя майстэрні з патрэбным абсталяваннем, пачаліся заняткі па асновах вытворчасці. Аднак праз некалькі гадоў адзінаццацігадовыя школы пачалі зноў пераўтварацца ў дзесяцігадовыя, і ў 1966-м школу скончылі адначасова дзесяці- і адзінаццацікласнікі.

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР 18 снежня 1968 г. М. Бельскаму было прысвоенае ганаровае званне заслужанага настаўніка БССР. На пасадзе кіраўніка ён знаходзіўся да 1972 г., а потым працягваў працаваць настаўнікам гісторыі. Мне давялося быць вучаніцай Міхаіла Паўлавіча, і я памятаю, што многія вучні былі зацікаўленыя прадметам, бо інфармацыю пра гістарычныя падзеі педагог імкнуўся ўвязваць з гісторыяй нашага краю. У старэйшых класах я наведвала гурток па гісторыі, які вёў наш настаўнік, памятаю, што ўжо тады ён рупіўся аб стварэнні школьнага музея. Міхаіла Паўлавіча няма з намі, але памяць пра яго жыве ў сэрцах вучняў, а лепшым помнікам педагогу застаецца школа, да з'яўлення якой ён спрычыніўся. Сёння тут па-ранейшаму гучаць дзіцячыя галасы.

Адметную старонку ў жыццё школы ўпісаў заслужаны настаўнік БССР Мікалай Данільчык. У дзяцінстве хлопчык перажыў сапраўдную трагедыю: паліцаі спалілі хату сям'і Данільчыкаў, якая жыла на адным з малюшыцкіх хутароў. У полымі загінулі бацька і маці, а малодшыя дзеці ўратаваліся ад пакутлівай і жахлівай смерці толькі таму, што іх у той час не было дома. Жылі дзе давядзецца, пакуль старэйшы брат не забраў іх у партызанскі атрад. Пасля вызвалення вярнуліся з лесу і пасяліліся ў сваякоў. Мікалаю тады ішоў шаснаццаты год, надта ж хацелася вучыцца, але давялося яму, кругламу сіраце, спалучаць вучобу з працай. Скончыў завочна Навагрудскае педвучылішча, потым – Баранавіцкі настаўніцкі інстытут, Магілёўскі педагагічны інстытут. Настаўнічаў у школах раёна: спачатку ў пачатковых класах, а потым пачаў выкладаць рускую мову і літаратуру. У 1954 г. прыйшоў у Карэліцкую СШ, праз тры гады быў прызначаны завучам і заставаўся на гэтай пасадзе да выхаду на пенсію.

Мікалай Мікалаевіч быў таленавітым і творчым чалавекам, таму і здолеў любоў сваю да літаратуры перадаць не аднаму пакаленню вучняў. Як удзельнік творчай групы настаўнікаў-эксперыментатараў пры Рэспубліканскім інстытуце ўдасканалення настаўнікаў у сваёй выкладчыцкай дзейнасці ажыццяўляў эксперымент па праблемах вывучэння рускай мовы. Вопытам заўсёды шчодра дзяліўся з калегамі на старонках педагагічных газет і часопісаў, пад час абласных, рэспубліканскіх і ўсесаюзных педагагічных чытанняў, на шматлікіх семінарах, лекцыях у Гродзенскім абласным інстытуце ўдасканалення настаўнікаў і раённай школе перадавога вопыту. За шматгадовую плённую дзейнасць на педагагічнай ніве быў узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны», значкам «Выдатнік народнай асветы», у 1989-м яму было прысвоенае званне «Заслужаны работнік народнай адукацыі Беларусі». Агульны працоўны стаж М. Данільчыка склаў больш за 50 гадоў!



*Будучы беларускі вучоны Андрэй Богуш у школьныя гады (1930-я гг.)*

У 1949 – 1951 гг. настаўнікам карэліцкай школы працаваў Міхаіл Петрыкевіч, будучы заслужаны настаўнік Беларусі (1965), які пазней стаў адным з арганізатараў народнага краязнаўчага музея ў Валеўскай школе, а ў 1967 – 1985 гг. – дырэктарам Дзятлаўскага раённага музея. Некаторыя настаўнікі пакінулі карэліцкую школу, каб заняцца навуковай дзейнасцю. Так, у 1962-м выехаў на вучобу ў аспірантуру Інстытута філасофіі АН БССР Іван Жыбуль, паступіў у аспірантуру і настаўнік рускай мовы і літаратуры Міхаіл Корчыц. У 1974 г. у школе пачала працаваць будучая заслужаная настаўніца Рэспублікі Беларусь (2012 г.) Ганна Шклярж, вучні якой сталі неаднаразовымі прызёрамі па біялогіі не толькі на рэспубліканскіх алімпіядах, але нават і на міжнароднай. Карэліцкую СШ скончылі дактары навук Андрэй і Аляксандр Богушы, Расціслаў Душук, Алесь Раковіч, Мікалай Вырко, Павел Вадап'янаў, Яўген Рахманько, дзяржаўны дзеяч Беларусі Уладзімір Еўтух.

Карэліцкія сцежкі памятаюць таленавітых падлеткаў, будучых настаўнікаў, вучоных, пісьменнікаў, мастакоў, урачоў і іншых выдатных спецыялістаў, якія некалі наведвалі мясцовую школу, дзе закладваўся падмурак іх ведаў, выхоўваліся лепшыя якасці, што дазволілі ім у далейшым пакінуць адметны след у жыцці раёна і краіны. Хачу на старонках газеты выказаць шчырыя словы падзякі многім таленавітым настаўнікам нашай школы за іх самаадданую працу.

У 1970-я гг. у Карэлічах пачалі будаваць новую школу на 1176 месцаў, якая пачала працаваць у канцы 1978 г. У 1972 – 1976 гг. дырэктарам установы быў выдатнік народнай адукацыі (1964) выкладчык хіміі Іван Страхоцкі. Яго замяніў на гэтай пасадзе Аляксандр Заяц. У трохпавярховым будынку старой школы размясціўся вучэбна-вытворчы камбінат, памяшканне былога народнага вучылішча заняла паліклініка, а потым – Дом піянераў. Праз некаторы час стала зразумела, што навучальнай установе ўсё роўна не хапае месца, таму ў будынку, узведзеным у 1961 г., адкрылася базавая школа, якая ў 1996-м пераўтварылася ў сярэднюю школу № 2. Так старая школа адрадзілася, вось толькі афіцыйна адлічваць свой узрост пачала з 1993 г.

***У 2018 г. школа № 2 адсвяткавала 25-годдзе (нагадаю, што будынак з'явіўся ў 1961 г.), а школа № 1 тады ж адзначыла 40-годдзе. Так многія пакаленні карэліцкіх выпускнікоў, якія скончылі школу ў 1960 – 1970-х гг. і раней, афіцыйна засталіся без школы. Вырашыла напісаць пра гэта, бо лічу, што заклік вядомага паэта «сеяць разумнае, добрае, вечнае», які ўвасобіўся ў працы лепшых настаўнікаў, мае дачыненне не толькі да школьных урокаў. Сеяць разумнае і вечнае немагчыма без захавання традыцыяў і ведання гісторыі школы, якой хутка будзе ўжо 160 гадоў. Будзем спадзявацца, што гэты юбілей школы адзначаць разам.***



*Вучні Карэліцкай школы. У цэнтры – дырэктар А. Дулемба, настаўніца Ф. Гардзееўская. Справа ў трэцім радзе стаіць Андрэй Богуш (у белай кашулі). 1930-я гг.*

*Святлана КОШУР,*
*выпускніца Карэліцкай СШ 1974 г.*

## Сямейная рэліквія



Алена Разумоўская

Мая любімая сямейная рэліквія – пішучая машынка (друкарка) «Continental», якой я вельмі ганаруся і берагу ўсё жыццё. Гэты рарытэт 1935 года выпуску перайшоў да мяне ад маці. У маладосці (цяпер маці 87 гадоў) яна працавала сакратаркай судовых пасяджэнняў у народным судзе, машыністкай і статыстыкам у райкаме КПБ, сакратаркай-машыністкай у пракуратуры Бярэзінскага раёна. За сваю працу маці атрымала шматлікія падзякі і ганаровыя граматы. Дарэчы, яна ўзнагароджана і двума медалямі: «Медаль мацярынства» (нарадзіла і выхавала пяць дзяцей) і «Ветэран працы». Машынка была нязменай памочніцай і дома. Калі маці пераходзіла на працу ў райана на пасаду сакратаркі-машыністкі, кіраўніцтва пракуратуры за добрасумленную працу ўзнагародзіла яе памятным падарункам – пішучай машынкай «Continental».

Коратка раскажу пра гісторыю гэтай машынкі. Друкарка «Continental» выпускалася ў нямецкім горадзе Хемніц на заводзе «Wanderer Werke» з 1903 года. Некаторы час яна была вядомым брэндам і карысталася вялікай папулярнасцю. А пішучыя машынкі, вырабленыя да 1942 года ўключна, лічацца аднымі з лепшых у свеце – па якасці, эрганоміцы і дызайне. У час Другой сусветнай вайны іх выпуск значна скараціўся, бо завод пераключыўся на вытворчасць прадукцыі для ваенных патрэб. У пачатку 1950-х гадоў завод па вырабе пішучых машынак, які знаходзіўся на тэрыторыі ГДР, зноў набірае сур'ёзныя абароты і выпускае каля 20 тысяч друкарак.

Прыкладна ў канцы 1970-х гадоў я пачала працаваць настаўніцай і сама карыстацца друкаркай. Спачатку трэніравалася друкаваць, запраўляць стужку, карыстацца паперай і капіркай. Пазней асвоілася, адчула сябе сапраўднай сакратаркай ці справаводам. Колькі на ёй было набрана розных матэрыялаў: сцэнарыі святаў, урокаў, заняткаў, дзелавой дакументацыі, працоўных планаў, маіх мастацкіх і публіцыстычных твораў!..

На змену маёй любімай сяброўцы прыйшоў камп'ютар, але я і цяпер з вялікай цеплынёю і ўдзячнасцю ўспамінаю тыя гады, калі друкарка шмат мне дапамагала.

*Алена РАЗУМОЎСКАЯ,*
*г. Салігорск*




# Гісторыя беларускіх мястэчак XV – XVIII стст.

***У 2020 г. пабачыла свет кніга вядомага беларускага гісторыка Юрыя Бохана (1966 – 2017) «Мястэчкі і працэсы ўрбанізацыі на землях Беларусі ў XV – XVIII стст.» (Мінск: Беларуская навука, 2020). Варта адзначыць, што гэта ўжо яе другое выданне (першае выйшла ў 2018 г.). Абодва былі падрыхтаваныя і выдадзеныя пасля заўчаснай смерці аўтара ў 2017-м. Кнігу падрыхтаваў Мікола Волкаў – вучань Юрыя Мікалаевіча. Разам з тым яе выданне стала супольнай справай многіх людзей, якія зрабілі свой унёсак ва ўшанаванне памяці выбітнага беларускага гісторыка, свайго калегі, настаўніка, сябра.***




Для многіх даследчыкаў і аматараў айчыннай гісторыі Ю. Бохан быў выбітным спецыялістам у гісторыі ўзбраення позняга Сярэднявечча і ранняга Новага часу. Разам з тым незаўважаным для многіх застаўся іншы навуковы кірунак, у якім ён плённа працаваў, – гісторыя мястэчак і гарадоў. Менавіта з урбаністыкі Ю. Бохан пачынаў сваю навуковую кар'еру. У 1990 г. ён паступіў у аспірантуру Інстытута гісторыі Акадэміі навук БССР, дзе пад кіраўніцтвам аднаго з найбольш аўтарытэтных на той час спецыялістаў па гісторыі Беларусі IX – XIII стст. – Георгія Васільевіча Штыхава – пачаў падрыхтоўку кандыдацкай дысертацыі «Мястэчкі вярхоўяў Віліі і нёманскай Бярэзіны ў XV – XVIII стст. (па археалагічных і пісьмовых крыніцах)». Варта адзначыць, што яшчэ ў студэнцкія гады малады гісторык удзельнічаў у археалагічных экспедыцыях у гэтым рэгіёне. Ужо як самастойны даследчык у 1991 – 1992 гг. ён праводзіў археалагічныя пошукі ў Лебедзеве, Лоску і Маладзечне, а ў лістападзе 1993-га тэкст кандыдацкай дысертацыі з ёмістымі дадаткамі ўжо прайшоў абмеркаванне і быў рэкамендаваны да абароны, што адбылася ў наступным годзе.

Нягледзячы на выразную пераарыентацыю навуковых інтарэсаў даследчыка на зброязнаўства і гісторыю вайсковай справы ў наступныя гады і падрыхтоўку доктарскай дысертацыі на гэтую тэму, Ю. Бохан не страціў цікавасці да ўрбаністыкі і сацыяльна-эканамічнай гісторыі Беларусі. З 2004 г. ён перайшоў на працу ў Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт, дзе ўзначаліў кафедру эканамічнай гісторыі. У той час ім былі падрыхтаваныя раздзелы па гісторыі гарадоў і гандлю на беларускіх землях у XV – XVIII стст. для другога і трэцяга тамоў шасцітомнай «Гісторыі Беларусі». А ў 2016 г. гісторык узначаліў супольны пяцігадовы праект «Мястэчкі ва ўрбаністычных працэсах на беларускіх землях Вялікага Княства Літоўскага ў XV – XVIII стст.». Відавочна, Юрый Мікалаевіч планаваў перапрацаваць на новым узроўні свае ранейшыя даследаванні па дадзенай праблематыцы, аднак завяршыць гэтую працу ён не паспеў. Таму ўзнікла ідэя сабраць і апублікаваць пад адной вокладкай яго напрацоўкі па ўрбаністыцы.

Кніга атрымала назву «Мястэчкі і працэсы ўрбанізацыі на землях Беларусі ў XV – XVIII стст.», а яе асновай стаў тэкст кандыдацкай дысертацыі, які раней не публікаваўся. Нягледзячы на тое, што з моманту яго напісання прайшло больш за дваццаць гадоў, а Юрый Мікалаевіч планаваў матэрыял грунтоўна перапрацаваць, дысертацыя заслугоўвае выдання ў першапачатковым варыянце. Па-першае, яна з'яўляецца прыкладам якаснага мікрагістарычнага даследавання. Такі падыход даў гісторыку магчымасць прааналізаваць максімальную колькасць крыніц па канкрэтным рэгіёне і ўдакладніць высновы, зробленыя папярэднікамі на больш шырокім матэрыяле. Па-другое, засяроджанне ўвагі на асобным рэгіёне дазволіла даследчыку ў пошуку адказаў на пастаўленыя пытанні паспяхова абаперціся адначасова і на пісьмовыя, і на археалагічныя крыніцы. Сінтэз вынікаў археалагічных даследаванняў, архіўных і бібліяграфічных пошукаў надалей застаецца досыць няпростай задачай для гісторыкаў. Па-трэцяе, у сучаснай беларускай гістарыяграфіі заўважны недахоп прац па сацыяльнай і эканамічнай гісторыі. Пры гэтым характар крыніц па гісторыі беларускіх зямель XVI – XVIII стст. сведчыць, што даследаванні ў такім напрамку з'яўляюцца вельмі перспектыўнымі. Урэшце, многія высновы, да якіх прыйшоў Ю. Бохан у сваёй кандыдацкай дысертацыі, важныя для далейшай распрацоўкі праблемы ўрбаністычнага развіцця беларускіх зямель у познім Сярэднявеччы і раннім Новым часе. Акрамя тэксту дысертацыі ў кнігу былі ўключаны апублікаваныя тэксты Юрыя Мікалаевіча па тэме ўрбаністыкі, аб'яднаныя ў чатыры раздзелы: «Мястэчкі», «Гарады і мястэчкі Беларусі ў перыяд Вялікага Княства Літоўскага», «Становішча гарадоў і развіццё гандлю ў Беларусі ў другой палове XVIII ст.» і «Урбанізацыйныя працэсы на беларускіх землях у XV – XVI стст.».

Пры падрыхтоўцы кнігі значная ўвага была звернута на падбор ілюстрацый. Вялікая колькасць малюнкаў маецца ў дадатках да дысертацыі. Пасля яе пададзены фотаздымкі і копіі дакументаў Ю. Бохана канца 1980-х – пачатку 1990-х гг., якія перадаюць атмасферу таго часу, калі малады даследчык пачынаў навуковы шлях, напрацоўваў матэрыял для кандыдацкай дысертацыі і рыхтаваў яе. Раздзел «Мястэчкі» забяспечаны копіямі арыгінальных планаў мястэчкаў канца XVIII – пачатку XIX ст., пра якія маюцца згадкі, што дазваляе праілюстраваць многія думкі і высновы, узнятыя ў гэтай частцы. Другі і трэці раздзелы забяспечаныя панарамамі беларускіх гарадоў, размешчаных па храналогіі іх стварэння, і даюць магчымасць скласці ўяўленне аб урбаністычным развіцці беларускіх зямель у XVI – XVIII стст.

***«Напісанае застаецца». Так сведчыць старажытнарымскі выраз. Кніга Юрыя Бохана, падрыхтаваная і выдадзеная пасля яго смерці, заняла сваё важкае месца ў беларускай гістарыяграфіі і відавочна істотна паўплывае на далейшае развіццё і пашырэнне даследаванняў гісторыі нашых гарадоў.***

*(Паводле публікацыі ў «Беларускім гістарычным часопісе», 2021, № 2)*

# Дзівосны музычны свет

Незвычайную любоў да музыкі яшчэ ў дзяцінстве праяўляла Вера Сходкіна. З малых гадоў дзівосны музычны свет паклікаў дзяўчынку і ўжо больш не адпусціў...

Дзіцячая школа мастацтваў у Росі стала пачаткам доўгага шляху ў музыку. Акадэмічныя канцэрты, святы, творчыя справаздачы – усяго гэтага з запалам чакала маленькая Вера. Калі ж стала пытанне аб выбары прафесіі, дзяўчына не вагалася. У хуткім часе яна была студэнткай Гродзенскага музычнага каледжа. Вера Валер'еўна не стала блукаць па свеце, шукаючы лепшай долі. Адразу пасля заканчэння навучальнай установы яна прыехала працаваць у Рось. Вочы дзяўчатаў і хлопцаў, якія прыходзілі займацца вакалам, нельга параўнаць ні з чым. Педагог заўжды падыходзіць індывідуальна да кожнага вучня, стараецца дапамагчы і супакоіць, калі ўзнікаюць складанасці. Да прыкладу, яе вучаніца Ганна Ганчарэвіч атрымала Дыплом лаўрэата I ступені міжнароднага фестывалю-конкурсу «Star fest» («Роская дзіцячая школа мастацтваў», Масква, 2021). Сама ж Вера Валер'еўна актыўна ўдзельнічала ў ансамблі «Асалода», падавала сваім вучням прыклад і прывівала любоў да музыкі.



Габрыэла Грабаўская і Вера Сходкіна

Жнівень 2021 года стаў пераломным момантам у жыцці маладога спецыяліста: менавіта ў гэты час яна пераязджае працаваць у Астравец у цэнтр культуры і народнай творчасці. Дзеці з задавальненнем прыходзяць на заняткі, удзельнічаюць у конкурсах, спяваюць, робяць свае першыя крокі ў свет музыкі. Вера Валер'еўна з'яўляецца ўдзельнікам ансамбля народнай песні «Кемяліна», вядзе дзіцячы гурток «Вясёлыя ноткі». За кароткі час яна паспела заваяваць любоў навучэнцаў і павагу калег. Прафесіяналізм, любоў да вучняў і сваёй справы дапамагаюць ёй пераадольваць цяжкасці і крочыць наперад. Яе вучні становяцца лаўрэатамі конкурсаў рознага ўзроўню: Паліна Мамонава атрымала Дыплом лаўрэата III ступені на міжнародным фестывалі-конкурсе «Пакаленне творчасці» (Екацярынбург), а таксама П. Мамонава і Габрыэла Грабаўская атрымалі Дыпломы лаўрэатаў III і II ступені «Конкурсу дзіцячых творчых работ» (Дзіцячая акадэмія развіцця; Казань). Сама ж Вера Валер'еўна радуецца кожнай перамозе маленькіх вакалістаў, якія спазнаюць дзіўны і прыгожы свет музыкі, што дае адчуванне самарэалізацыі.



Вера Сходкіна

*Вольга ЗАЯНЧКОЎСКАЯ,*
*бібліятэкар*
*Астравецкай раённай бібліятэкі*



## У сваёй будцы і сабака тыгр



***Уздоўж***

**1**. Імя міфічнага князя, першанасельніка Беларусі; паводле міфа, па слядах яго любімых сабак Стаўры і Гаўры пацяклі рэкі Дняпро і Дзвіна. **2**. Ласкавая мянушка, што з даўніх часоў давалі сяляне карове. **5**. Конь скідвае седака на сваю грыву і хвост, а ... – на рогі і капыты (прык.). **7**. Ласкавае ... дзве маткі ссе (прык.). **9**. Нядобрая ..., калі вые сабака (прык.). **10**. Мядзведзь карове не ... (прык.). **14**. Расліна сямейства злакавых. **15**. Позняя восеньская прыгожая кветка. **16**. Бясколерная вадкасць у целе чалавека і жывёл. **18**. У гімнастыцы выстаўленне сагнутай нагі ў якім-небудзь напрамку. **19**. Беларуская багіня ўраджайнасці і апякунка шлюбаў. **20**. Прыгожая ...: баран ды ярачка (прык.). **23**. Каза для воўка не сяброўка, а ... (прык.). **24**. Лепш карміць аднаго ката, чым ... мышэй (прык.). **25**. Свіння «хру», дык і ... «хру» (прык.). **26**. Каманда страляць.

***Упоперак***

**1**. Конь у гаспадарцы – ... (прык,). **3**. Які ..., такі і прыплод (прык.). **4**. Зварот у суд. **6**. «Ёсць у Паўліка дружок – // Хітры, шэранькі ...». З верша Г. Дашкевіч «Коцік Кузя». **8**. ... з цвіком, а снежань з мастом (прык.). **11**. Драпежная млекакормячая жывёліна. **12**. Такая ..., як сабака сякеру з'еў і дзёгцем запіў (прык.). **13**. Баранаў на ... не запрашаюць (прык.). **17**. І ваўкі сытыя, і ... цэлыя, а пастуху вечная памяць (прык.). **18.** Беларускі язычніцкі бог, апякун свойскай жывёлы. **21**. Травяністая расліна з прыемным вострым пахам. **22**. І ... песні пяе, калі добра жыве (прык.).

*Склаў Лявон ЦЕЛЕШ*

## Студзень

**18 – Лангбард Іосіф Рыгоравіч** (1882, Гродзенская губ. – 1951), архітэктар, педагог, адзін з заснавальнікаў савецкай архітэктуры Беларусі, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, сярод асноўных працаў якога – Дом урада, будынак Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь, Цэнтральны Дом афіцэраў (Мінск), Дом Саветаў (Магілёў) і інш. – 140 гадоў з дня нараджэння.

**20 – Карпаў Аляксандр Якаўлевіч** (1922 – 1998), кінарэжысёр, сцэнарыст, акцёр, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі і Казахстана, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Казахстана (1966) – 100 гадоў з дня нараджэння.

**20 – Тарашкевіч Браніслаў Адамавіч** (1892, Віленскі пав. – 1938), грамадска-палітычны дзеяч, мова- і літаратуразнаўца, перакладчык, аўтар першай «Беларускай граматыкі для школ» (1918), акадэмік НАН Беларусі – 130 гадоў з дня нараджэння.

**20 – Шырма Рыгор Раманавіч** (1892, Пружанскі р-н – 1978), харавы дырыжор, фалькларыст, музычны і грамадскі дзеяч, публіцыст, народны артыст Беларусі і СССР, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1966, 1974) – 130 гадоў з дня нараджэння.

**23 – Асвяцінскі Геральд Баляслававіч** (1932, Асіповіцкі р-н – 2006), дзеяч тэатральнага мастацтва, заслужаны дзеяч культуры Беларусі – 90 гадоў з дня нараджэння.

**23 – Кулагін Анатоль Мікалаевіч** (1947, Барысаў), мастацтвазнаўца, гісторык архітэктуры, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1990), прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» (2002) – 75 гадоў з дня нараджэння.

**23 – Пакроўскі Барыс Аляксандравіч** (1912 – 2009), оперны рэжысёр, педагог, народны артыст Беларусі і СССР, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1947, 1948, 1949, 1950), Ленінскай прэміі (1980), Дзяржаўнай прэміі Расіі (1994), шэрага тэатральных прэміяў Расіі – 110 гадоў з дня нараджэння.

**25 – Жукаўскас Альбінас Пранавіч** (1912 – 1987), літоўскі пісьменнік, перакладчык твораў беларускай літаратуры, заслужаны дзеяч культуры Літвы, заслужаны работнік культуры Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Літвы (1976) – 110 гадоў з дня нараджэння.

**25 – Скрыпнік Мікалай Аляксеевіч** (1872 – 1933), вучоны-гісторык, акадэмік НАН Беларусі і Украіны – 150 гадоў з дня нараджэння.

**25 – Ткачоў Уладзімір Віктаравіч** (1947, Уздзенскі р-н), мастак, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі – 75 гадоў з дня нараджэння.

**26 – Акружная Святлана Арцёмаўна** (1947), актрыса тэатра і кіно, народная артыстка Беларусі, лаўрэат прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» (2005), уладальніца прыза Беларускага саюза тэатральных дзеячаў «Крыштальная Паўлінка», ордэна Францыска Скарыны, дзяржаўная дзяячка – 75 гадоў з дня нараджэння.

**26 – Фядзяева Ніна Рыгораўна** (1912 – 1990), расійская і беларуская актрыса, заслужаная артыстка Беларусі і Карэліі – 110 гадоў з дня нараджэння.

**28 – Радзівіл Удальрык (Ульрык) Крыштоф** (1712, Дзятлава – 1770), дзяржаўны дзеяч ВКЛ, генерал-лейтэнант, паэт, гісторык – 310 гадоў з дня нараджэння.

**30 – Інстытут беларускай культуры** (Інбелкульт; 1922, Мінск – 1928), першая ў гісторыі Беларусі шматгаліновая навукова-даследчая ўстанова, папярэднік НАН Беларусі – 100 гадоў з дня заснавання.

### З падслуханага

#### Добрыя намеры

Госця ў захапленні гаворыць гаспадыні:

– Ой, у вас, відаць, спартыўная сям'я: столькі гантэляў, гіраў…

– Сапраўды, – іранічна ўсміхаецца гаспадыня. – Вось ужо гадоў дваццаць муж збіраецца заняцца цяжкай атлетыкай!

#### Пашанцавала

– Кажуць, што ў цябе, Уладзімір Васільевіч, шыкоўная іншамарка з'явілася…

– Пашанцавала: удала прадаў свайго старога «Запарожца», дык набыў новы аўтамабіль і дачцэ вяселле справіў!

#### Клопаты пра пасажыраў

– Чаму ў прывакзальнай сталоўцы такія маленькія порцыі яды?

– Для таго, каб пасажыры не спазняліся на цягнікі.

#### «Маладая»

Сустрэліся дзве старэнькія бабулькі. Адна скардзіцца:

– Нездаровіцца мне. У старасці ўсе хваробы чапляюцца…

– І не толькі ў старасці! – перабівае яе другая бабулька. – Цяпер і маладыя слабыя. Я вось таксама захварэла…

*Міхась СЛІВА*

# Малая краязнаўчая энцыклапедыя

***(Пачатак у № 1 за 2003 год)***

**РАЗМАЛЁЎКА ПА КЕРА́МІЦЫ** – дэкарыраванне посуду, архітэктурна-дэкаратыўнай і дэкаратыўнай керамікі ангобамі, глазурамі, эмалямі, пігментамі, люстрам, вокісламі і солямі металаў. На Беларусі вядома з XII ст. У канцы XVI – пачатку XVII ст. кафлю і посуд аздаблялі размалёўкай рэльефу палівамі і эмалямі розных колераў (т.зв. цанінныя вырабы; мірская кафля, гродзенская кафля, вырабы са Слоніма, Віцебска). З 1-й паловы XVII ст. была пашырана размалёўка посуду і цацак ангобам (белым, чырвоным, зялёным і інш.) з дапамогай ражка ці пэндзліка (бытаваў да канца XVII ст.). У дэкоры найчасцей выкарыстоўвалі геаметрычны, раслінны арнамент, анімалістычныя выявы, часам іх спалучэнніі (вырабы Лідскага, Мірскага, Крэўскага, Гальшанскага замкаў, Гродна, Магілёва, Віцебска). З канца XVII – 1-й паловы XVIII ст. на Беларусі пашырылася размалёўка каляровымі палівамі па чарапку (вырабы з Мсціслава, Гродна, Слоніма, Мірскага замка) і сырой эмалі, з XVIII ст. вядома кафля, размаляваная сінім кобальтам па белай эмалі. З 2-й паловы XVIII ст. у Беларусі існавала фаянсавая вытворчасць, дзе вырабы дэкарыравалі падглазурнай і надглазурнай размалёўкай. У канцы XIX ст. для размалёўкі па кераміцы, асабліва ў кафлянай вытворчасці, выкарыстоўвалі багатую палітру колераў, золата, люстр (вырабы з Копысі, Віцебска). У сучасным беларускім дэкаратыўна-ўжытковым мастацтве пашыраны падглазурная размалёўка фарбамі па абпаленым чарапку, размалёўка ангобам, солямі розных металаў (кобальт, хром і інш.) для аздаблення вырабаў з фарфору, фаянсу, шамоту, гліны (Мінскі і Добрушскі фарфоравыя заводы, аб'яднанне «Беларуская мастацкая кераміка», Івянецкая фабрыка мастацкай керамікі і вышыўкі). Побач з ручной размалёўкай выкарыстоўваюць дэколь, шоўкатрафарэтны друк, фотаметад, аэраграфную тэхніку з ужываннем шаблонаў і інш. Сучасныя беларускія мастакі-керамісты шырока карыстаюцца размалёўкай па кераміцы пры стварэнні дэкаратыўных манументальна-дэкаратыўных твораў: вазы «40-годдзе вызвалення» (Тацдяна Пятроўская, Ю. Крамко) і «Юбілейная» (Зарына Баўтрук-Раўко, Крамко; 1984), кампазіцыі «Цырк» Л. Малышава (1978), «Спадчына» Анатоля Концуба (1979) і інш. Пры стварэнні станковых і манументальна-дэкаратыўных працаў мастакі шырока выкарыстоўваюць размалёўку па шамоце, фаянсавай плітцы: кампазіцыі «Печ» (1976), «Лета ў Браславе» (1979), «Госці ў хату» (1980) Мікалая Байрачнага, «Мастак і мадэль» Аляксандра Зіменкі (1979), «Зіма. Жодзіна» Мікалая Шышлава (1980), «Алень» Валянціны Буцінай (1976), дэкаратыўная плітка і серыя пано ў рэстаране «Планета» ў Мінску Мікалая Байрачнага і Валянціна Прыешкіна (1979) і інш.; пано «Паляванне ў Белавежскай пушчы» Зіменкі ў рэстаране «Беларусь» у Брэсце (1979), «Садоўніцы» (1980) на апорнай сценцы каля ўвахода ў гасцініцу «Планета» ў Мінску і «Юнацтва» ў санаторыі «Аксакаўшчына» (Валожынскі раён, 1975 – 1976) Яўгена Кузняцова і інш. Асаблівасцямі дэкору вылучаюцца бабінавіцкая кераміка, бабруйская кераміка, віцебская кераміка, івянецкая кераміка, гараднянская кераміка, ракаўская кераміка.



*Размалёўка «Паляванне ў Белавежскай пушчы»*

Газета зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 384 ад 08 мая 2014 г.
Заснавальнікі: грамадскае аб'яднанне «Беларускі фонд культуры»; Гілеп Уладзімір Аляксандравіч.

Краязнаўчая газета

Індэкс індывідуальнай падпіскі – 63320
ведамаснай – 633202

Галоўны рэдактар – Максім ГАЛЬПЯРОВІЧ.
Адказны сакратар Алесь Сачанка.
Рэдкалегія: Уладзімір Гілеп (старшыня), Анатоль Бутэвіч, Навум Гальпяровіч, Радзім Гарэцкі, Ганна Запартыка, Павел Каралёў, Алесь Карлюкевіч, Аляксандра Кравец, Ігар Пракаповіч, Павел Сапоцька, Віктар Скорабагатаў, Тадэуш Стружэцкі, Аляксандр Суша.

Наш адрас: 220029, г. Мінск, вул. Траецкая набярэжная, 6. Тэл. 283-28-26. Тэл./факс 334-42-03 E-mail: kraga@tut.by

З-за абмежаванасці сродкаў выданне безганарарнае. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, імя і імя па бацьку, асноўнае месца працы, зваротны адрас.
Меркаванні аўтараў могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі.
Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.
Пры перадруку спасылка на «Краязнаўчую газету» абавязковая.

Падпісана да друку: 19.01.2022
Газета надрукавана ў друкарні ТДА «Знамение» (Мінск, вул. Каржанеўскага, 14). Ліцэнзія ЛП № 02330/85 ад 29.03.2004.
Заказ 22.
Тыраж 408 асобнікаў.